**20 кастрычніка – 165** гадоў з дня нараджэння **БАРКОЎСКАГА ДУНІНА АЛЬФОНСА** (1850, в. Плянта, Кобрынскі раён – 1905), беларускага мастака

Баркоўскі Дунін Альфонс (1850, в. Плянта, Брэсцкая вобл. - 1905) - беларускі жывапісец. Нарадзіўся ў сям'і Мікалая і Юліяны (у дзявоцтве Громадзінскай) Дунін Баркоўскіх. Вучыўся ў Варшаўскай рысавальнай школе, у майстэрні Я. Матэйкі ў Кракаве (1882 – 85). Гэта адзін з тых беларусаў, якія, атрымаўшы адукацыю ў Віленскай рысавальнай школе І. П. Трутнева і не маючы сродкаў для далейшага мастацкага ўдасканалення, заставаліся працаваць настаўнікамі малявання ў павятовых і губернскіх гарадах.

З 1888 г. жыў на радзіме, стварыў шэраг пейзажаў. У 1896-1898 гг. працаваў у в. Быкавізна, Свілы Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці, пісаў партрэты і карціны на рэлігійныя сюжэты для пахавальні сям'і Козел-Паклеўскіх. У 1898 г. пабраўся шлюбам з Марыяй Місунянкай і ў Свіле на Віленшчыне адкрыў майстэрню. Пасля смерці жонкі з'ехаў у Бікбарды, маёнтак Паклеўскіх на Урале. Ад 1905 г. жыў у Сухеднёва (Келецкі павет).

Аб прыналежнасці Д. Баркоўскага да мастацтва Беларусі гавораць тыя нешматлікія творы, што захаваліся. Паказальны ў гэтых адносінах акварэльны



эскіз яго бытавой карціны «Беларуская карчма» (месца знаходжання невядома), датаваны 1864 г. У эскізе паказана тыповая для таго часу сцэнка, якая трапна характарызуе жыццё і побыт сялян пасляртэформеннай Беларусі. Нават няўпэўнены малюнак і некалькі ўмоўны каларыт работы гавораць пра імкненне мастака да адлюстравання сацыяльных з'яў.

Д. Баркоўскі вядомы пераважна як аўтар жанравых карцін: «Хворая жанчына (1893), «Мыта на Беларусі» (1899), «Паляванне на мядзведзя», «Лоўля рыбы восцямі».

*Матэрыял падрыхтаваны ў 2015 г. Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай. Курачук Святлана Дзмітрыеўна, галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі*


[**Баркоўскі Дунін Альфонс**] // Гісторыя беларускага мастацтва : у 6 т. / рэдкал. : С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) і інш. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – Т. 3. Канец 18 - пачатак 20 стагоддзя. - С. 205, 206, 231.

**Яніцкая, М. М.** Баркоўскі Дунін Альфонс / М. М. Яніцкая // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / рэдкал. : Г. П. Пашкоў (гал. рэд.). – Мінск : БелЭн, 1996. – Т. 2. - С. 309.

**Яніцкая, М. М.** Баркоўскі Дунін Альфонс / М. М. Яніцкая // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва : у 5 т. - Мінск: БелСЭ імя П. Броўкі, 1984. – Т. 1. - С. 294.

**1850. В деревне Плянта** Брестской области родился Дунин Альфонс Барковский (ум. 1905) – белорусский художник. Люди, события, факты, происшествия // Деловая газета. – 2015. - Режим доступа: http:// bdg. by/ news/news.htm

**Альфонс Дунін-Баркоўскі //** Вікіпедыя : вольная энцыклапедыя – Рэжым доступа : https://be-x-old.wikipedia.org/wiki/Альфонс_Дунін-Баркоўскі. – Дата доступа : 14.09. 2015.

**d’Abancourt H**. Borkowski Alfons Dunin. // Polski słownik biograficzny. T. II. Kraków. - 1936. - S. 330.